# Каб кніга стала бліжэй да чытача

**У Цэнтральнай дзіцячай бібліятэцы імя М. Астроўскага абмеркавалі ролю кніжнай скарбніцы ў выхаванні чалавека як асобы. Дырэктар Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк Тацццяна Швед і старшыня Мінскага гарадскога аддзялення СПБ Міхаіл Пазнякоў распавялі пра важнасць чытання і ролю прыгожага пісьменства ў грамадстве, звярнуўшы ўвагу на супрацоўніцтва бібліятэкараў і літаратараў.**

Галоўны бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вольга Палунчанка шчыра падзякавала бібліятэкарам за іх працу, пажадала творчага натхнення і падзялілася вопытам, як яе праект, прысвечаны 80-годдзю вызвалення краіны, знайшоў водгук у школах і стаў сапраўды запатрабаваным. Так, улічваючы ўзрост навучэнцаў, пра подзвіг абаронцаў Брэскай крэпасці распавяла праз паэтычнае слова. Вольга Палунчанка расказала пра важнасць праграмы «Прафесар» і шэраг праектаў, сярод якіх вылучаецца «Быць вартым Вялікай Перамогі». Яна таксама анансавала адкрыццё ў студзені 2025-га дзіцячага кніжнага цэнтра Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Рэспубліканскую дзіцячую навукова-практычную канферэнцыю «Застацца чалавекам у полымі вайны» (адбудзецца 6 мая 2025 года ў Мінску з удзелам навучэнцаў з Расійскай Федэрацыі). А яшчэ Вольга Палунчанка выказала прапанову перавыдаць кнігі, прысвечаныя піянерам-героям.

Дырэктар Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі Людміла Гурыновіч распавяла, што робіцца, каб аматары кніг з ахвотай наведвалі кніжніцу. Сапраўды, паказчыкі выдатныя: звыш 22 тысяч чытачоў, 127 тысяч наведванняў за год, больш за 1,5 тысячы мерапрыемстваў, звыш 91 тысячы экзэмпляраў кніг выдаецца ў бібліятэцы.

Наколькі важна ездзіць ва ўсе куткі краіны, каб беларуская кніга стала бліжэй да чытача, нагадала Святлана Ганцарэвіч, намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда»: «Гэта няпроста, але патрэбна, таму столькі ўвагі і сродкаў (у тым ліку маральных сіл) удзяляецца арганізацыі і правядзенню шматлікіх прэзентацый кніг ва ўстановах адукацыі і бібліятэках, удзелу ў розных літаратурных фестывалях. “Звязда” будзе працягваць гэтую карпатлівую работу надалей. У рэгіёнах чытачы не настолькі “разбэшчаны” жывымі стасункамі з літаратарамі, аўтограф-сесіямі». Прысутныя прадстаўнікі бібліятэк з рэгіёнаў выказалі вялікую падзяку СПБ і Выдавецкага дома «Звязда» за тое, што яны сумесна заўжды знаходзяць магчымасць прывезці пісьменнікаў нават у глыбінку.

Вядучы рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Аксана Малішэўская-Спрынчан распавяла пра кнігі-навінкі. Галоўны рэдактар часопіса «Бярозка» Яніна Каралёва падзялілася вопытам наладжвання кантакту з чытачом праз сацсеткі і падзякавала старшыні СПБ, дырэктару — галоўнаму рэдактару Выдавецкага дома «Звязда» Алесю Карлюкевічу за падтрымку беларускамоўнага кантэнту на партале *www.zviazda.by.*

**Ірына ПРЫМАК**